**АРХІТЭКТУ́РА МАЛЫ́Х ФОРМ**, малыя архітэктурныя формы, від архітэктуры, звязаны з арганізацыяй адкрытай прасторы і добраўпарадкаваннем архіт.-ландшафтнага асяроддзя. Разам з манументальна-дэкар. мастацтвам і архітэктурай аб'ёмных збудаванняў удзельнічае ў стварэнні маст. вобраза нас. пунктаў. Прадстаўлена рознымі тыпамі, мае функцыянальна-дэкар. значэнне (фантаны, мосцікі, лесвіцы, паркавыя павільёны, калодзежы, лаўкі, агароджы, кіёскі, ліхтары), носіць мемар. (надмагіллі, стэлы) і культавы (капліцы) характар, выступае носьбітам інфармацыі (рэкламныя шчыты, шыльды). У Беларусі вядома з 17 ст. Атрымала пашырэнне ў эпоху барока і класіцызму як элемент садова-паркавай кампазіцыі. У 20 — пач. 21 ст. элемент фарміравання эстэтычнага аблічча дарог (аўтобусныя павільёны, кэмпінгі і інш.). Пад уплывам постмадэрнізму склаўся новы тып А.м.ф. — стылізаваныя дэкар. кампазіцыі з гіст. матывамі: крэпасці, ветракі, драўляныя вазы і інш. З развіццём турысцкай інфраструктуры стала неад'емным кампанентам арганізацыі прадметна-прасторавага асяроддзя зон адпачынку. *Ю.Ю.Захарына.*

*Да арт.* ***Архітэктура малых форм****: 1 — крэпасць у в. Акцябрская Віцебскага р-на; 2 — капліца ў в. Мосар Глыбоцкага р-на.*



*1*



*2*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ